калькі жыццяў. Наперадзе — новыя творчыя задумы, новыя адкрыцці.

**Ірына ГОЎЗІЧ**

## ШЛЯХІ МАСТАЦКАЙ РЭАЛІЗАЦЫІ ІДЭІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ Ў ТВОРЧАСЦІ НІЛА ГІЛЕВІЧА І ЯНКІ СІПАКОВА

Так гістарычна склалася, што беларусам многія стагоддзі даводзіцца адстойваць права «людзьмі звацца». У гэтым вінаватыя і абставіны, бо беларускі народ жыве паміж мацнейшых суседзяў, і ён сам, таму што «недабраў» нечага важнага ў жыцці. Магчыма, гэтым важным і з'яўляецца пачуццё *нацыянальнай* годнасці і адметнасці. Мы спецыяльна вылучылі слова «нацыянальнай», бо годнасці чыста чалавечай, усведамлення сябе асобай і ўмення адстойваць сваю асабовасць беларусу не займаць. З часоў Усяслава Чарадзея, Ефрасінні Полацкай, Францыска Скарыны, Кастуся Каліноўскага, Янкі Купалы ён даказаў гэта, выказаў вядомымі словамі класіка: «Ніколі, браткі, не забуду, Што чалавек я, хоць мужык». Выкажам з нагоды закранутай праблемы, магчыма, крамольнае і не ўсімі прымальнае меркаванне: з глыбокай старажытнасці, відаць, беларусы ўсвядомілі сябе сынамі чалавецтва, і толькі пазней, ва ўмовах жорсткага ціску з Усходу і Захаду, пачалі актыўна бараніць нацыянальную годнасць, выхоўваць у сабе і сваіх нашчадках пачуццё прыналежнасці да своеадметнага этнасу.

Як бы там ні было, працэс «выхавання» актыўнай нацыянальнай самасвядомасці працягваецца і зараз. Працягваецца ва ўмовах неспрыяльных у XX стагоддзі. Неспрыяльных таму, што многія краіны даўно перажылі радасныя хвіліны самастойнага развіцця, думаюць пра інтэграцыю не толькі эканомікі, але і культуры. На Захадзе ўвогуле адбываецца працэс стварэння постіндустрыяльнай масавай гуманітарнай адукацыі, літаратуры, іншых відаў мастацтва, і парасткам нацыянальнага даводзіцца выжываць у складаных умовах. Нам жа, беларусам, зноў неабходна развівацца паскорана: і адраджацца, і старацца не адстаць ад працэсаў агульначалавечай цывілізацыі. Вось чаму такой суцэльнай трывогай прасякнута творчасць многіх бела-

рускіх пісьменнікаў за лёс нацыянальнай культуры, роднай мовы, роднай школы, за выжыванне народа ў складаны час.

Адзначым, што эмацыйная эйфарыя другой паловы 80 — пачатку 90-х гадоў у сувязі з распадам СССР і атрыманнем суверэнітэту ўжо тады выяўралася цвярозымі выказваннямі палітыкаў і мастакоў пра цяжкі працэс спраўджвання надзей на адраджэнне. Вязень Калымы Масей Сяднёў з гэтай нагоды пісаў: «Наш нацыянальны Дух не набыў яшчэ той палымянасці, аб якой гаварыў апостал Павел. Мы знаходзімся цяпер у пошуках такога стану, пры якім успыхнула б іскра, што запаліла б паходню нашага Духу». Словы выдатнага паэта, празаіка, публіцыста, які і каля чужых берагоў не страціў чуцця Радзімы, веры ў перамены да лепшага, спраўджваюцца сёння. І ва ўмовах суверэнітэту, адноснай незалежнасці мы зноў сутыкаемся з імкненнем страціць заваяванае высокай цаной, здаць добраахвотна свае пазіцыі. Можа, сёння якраз надзвычай далёка да адраджэння, далей, чым у 20-я гады нашага стагоддзя.

Масей Сяднёў не адзінокі ў сваім недаверы да таго, што ў нашай краіне адбудзецца ўрэшце доўгачаканае адраджэнне. Пімен Панчанка пакінуў нас з балючымі словамі пра нашыя страты — мовы, культуры, сябе («Развітанне»). Ніл Гілевіч задаў трывожнае пытанне ў кнізе з гаваркім загалоўкам: «На высокім алтары»: «Ці дойдзем мы да Беларусі?» Янка Сіпакоў у прытчы «Тыя, што ідуць», адправіў у далёкі, магчыма, бясконцы шлях сваіх невідушчых, якія будуюць на зямлі дамы, але не карыстаюцца са свае працы, шмат робяць, але неўсвядомлена. Ці ўбачаць яны калі-небудзь белы свет і, не тоячыся, пакажуць сябе іншым людзям? А можа, застануцца ў «зацьмішчы, у завеі», як купалаўскія паязджане? Пытанні застаюцца адкрытымі. І адказаць на іх павінны мы, чытачы, народ.

Нам здаецца, што ідэя нацыянальнага самапазнання (адраджэння) у беларускай літаратуры выяўлялася ў асноўным у двух варыянтах. Першы можна ўмоўна назваць адкрыта публіцыстычным. Прыхільнікам падобнага «адкрытага» выказвання па нацыянальных і многіх іншых пытаннях быў Янка Купала — публіцыст і аўтар вершаў «Маладая Беларусь», «А хто там ідзе?», «Ворагам беларушчыны», «Беларускія сыны» і інш. Да ліку палымяна-публіцыстычных твораў, у якіх бруіцца і магутнае лірычнае пачуццё, адносяцца многія паэтавы творы 1918—1922 гадоў. Купалу тады ахапіла трывога за край «забраны», за паняволеных сыноў («Беларускія сыны»). Яго непакоіла вост-

рая думка пра страту спадчыны («Спадчына»). Нікога і нічога не баючыся, паэт выказаў свой боль з-за стратаў, а не набыткаў, папярэдзіў свой народ, што яго можа спасцігнуць сапраўднае бедства — страта незалежнасці, сябе як нацыі. Ён як бы здрыгануўся ад жаху, прадбачачы падобную будучыню («Перад будучыняй»):

Няўжо нас не аб'ясніць розум ясны,
І не пакінем біцца з кута ў кут?
Няўжо кліч вечны будзе ў нас напрасны —
Кліч бураломны: вызваленне з пут?

За падобныя адкрытыя выказванні песняры караліся арыштамі, а то і смерцю. Напісаў, напрыклад, у суровыя 30-я гады Алесь Дудар верш «Пасеклі наш край» — пра падзел Беларусі на часткі без яе згоды на тое — і быў арыштаваны, кінуты ў турму, урэшце — расстраляны, нягледзячы на агульную лаяльнасць да ўладаў, ідэйную перакананасць у гістарычнай місіі сацыялізму па-сталінску. Не даравалі і Язэпу Пушчу яго выказванне пра ўкрыжаваную на перасячэнні ўсходне-заходніх дарог Радзіму. Аднак гэта быў не адзіны варыянт выказвання сваіх думак пра набалелае і вострае.

У таго ж Янкі Купалы ёсць цудоўная сімваліка-алегарычная рэч «На Куццю». Чаму яна так доўга «расчытвалася» літаратуразнаўцамі? Ці не таму, што ў ёй надзвычай выразная паралель паміж днём мінулым, якім можна ганарыцца нашчадкам-патрыётам, і днём пазнейшым, калі можна страціць набыткі, нацыянальную адметнасць? Відаць, гэтая ідэя не дазволіла знаўцам слоўнага мастацтва ў 30-я і пазнейшыя гады выказацца адкрыта і недвухсэнсоўна: нават у застойны час афіцыйнай была палітыка стварэння адзінай нацыі — «савецкага народа», палітыка падтрымкі касмапалітызму, манкуртства. У Купалавым творы ідэя выказваецца па-філасофску заглыблена, набывае касмічныя абсягі, паэт лучыць нацыянальнае і агульначалавечае, знітоўвае розныя часавыя вымярэнні. Чытач сам павінен зрабіць вывад, наколькі трагічна склалася сітуацыя для беларусаў яшчэ ў пачатку XX стагоддзя. Гэтаксама «ўскосна», «апасродкавана», пры дапамозе травесціі, іншасказання, сатыры і гумару абараняе нацыянальную ідэю Купала і ў трагікамедыі «Тутэйшыя». Блізкім да яго шляхам, разгортваючы сімвал за сімвалам, ідзе празаік Вячаслаў Адамчык у сваёй тэтралогіі («Чужая бацькаўшчына», «Год нулявы», «І скажа той, хто народзіцца», «Голас

крыві брата твайго»), Янка Сіпакоў — у кнізе «Веча славянскіх балад» . Праз любоў да роднага слова, паказ яго магутнейшых сэнсавых, знакавых і іншых магчымасцяў бараніў нацыянальнае ад нігілістычна-непрыхільных адносін Фёдар Янкоўскі. А Янка Брыль? Яго беларускасць мае выразны твар таму, што паўстае на фоне агульначалавечага, талерантнасці ў адносінах да чужога, у тым, што здаровы патрыятычны пачатак аўтар шукае як бы на памежжы, сумежжы, у якіх апынуўся наш народ у выніку розных абставін. Яскравым прыкладам спалучэння нацыянальнага і агульначалавечага можа служыць творчасць Максіма Танка. Прычым ідэі адраджэння, выхавання нацыянальнай свядомасці падаюцца ў паэзіі славутага майстра не адкрыта, а прытчава, у сімвалічнай, метафарычнай форме. Яны вынікаюць найперш з *выхавання любові да роднага, свайго*, адметнага, уласцівага беларусам:

Аслепшы,
Яшчэ можна з кульбакай
Дарогу дадому знайсці.

Аглохшы,
Яшчэ будзеш чуць
Скрып дзвярэй сваёй хаты.

Анямеўшы,
З сябрамі бяседу вясці
Ва ўспамінах.

Толькі страціўшы Радзіму,
Будзеш, як камень,
Сляпы, і глухі, і нямы.

Прыхільнікам адкрытай, схільнай да публіцыстычных формаў выказвання набалелага ў паэзіі з'яўляецца Ніл Гілевіч. Мы ўжо згадвалі шматзначнае яго выказванне са зборніка «На высокім алтары» — «Ці дойдзем мы да Беларусі?». Пытанне вострае. Пастаўлена не выпадкова: паэт балюча перажывае рэзкае паніжэнне нацыянальнай свядомасці ў народзе, у лепшых яго сыноў і дачок — прадстаўнікоў інтэлігенцыі. Ён дакарае сябе і іншых, як некалі гэта рабіў Купала, у баязлівасці, манкурцтве, абыякавасці, прадажнасці за часовую сытасць, кавалак каўбасы і шмаццё. Асабліва актыўна выступае супраць страты нацы-

янальнай адметнасці і духоўнасці паэт у зборніку вершаў «Ёсць зямля...» (1997). Радкі многіх вершаў кнігі — лозунгавыя, інтанацыя — заклікавая, купалаўская:

Браты! Ачніцеся! Няўжо вам
Не чутна, хоць бы і праз сон,
Як прамаўляе Божым словам
Да вашых сэрцаў вешчы звон?

Тыя ж самыя рухомыя радкі — часцінкі болю, тыя ж вобразы рамантычна-алегарычнага кшталту — «сон», «Божае слова», «вешчы звон», тая ж напружаная рытміка і звышэмацыянальная інтанацыя, што і ў купалаўскім «Прароку». Сын свайго часу, як і яго вялікі папярэднік у пэўны трагічны час, Гілевіч бачыць, што многае ў жыцці паўтараецца, што эксперымент над маўклівым народам працягваецца і «на схіле веку» (формула П. Панчанкі). І ён не маўчыць. Сэрца яго прасякнута нянавісцю да раўнадушных і маўклівых. Так, менавіта нянавісцю, а не звычайнай чарговай незадаволенасцю. Паэт не шкадуе сваіх супляменнікаў. Называе рэчы сваімі імёнамі. Ідзе нават далей за Купалу, аўтара шэдэўра «Перад будучыняй», у якім паказаны не толькі знешнія прычыны «разбеларушвання» беларусаў, але і выяўлены псіхалагічныя асновы гэтай у многім фенаменальнай з'явы. Мастак слова дакопваецца да асновы асноў не толькі як канстататар таго, што адбылося, але і як прарок, што прадказвае ў сувязі з гэтым яшчэ больш страшныя, жахлівыя трагедыі.

Паэт пайшоў далей за Купалу ў стварэнні шматаблічнага вобраза сучаснага здрайцы спрадвечным патрыятычным ідэалам. У вершы «Не хвалюйцеся» — гэта «зладзюганы і рабаўнікі», «мафіёзнік», якія «абабралі чэсны люд да ніткі». У другім творы — «Тым, што вялі і натхнялі» — з'яўляюцца «слугамі лісткоў паршывых», «стары вучоны ўдод», «тварэц кінафальшывак», «няздара-вершаплёт». У многіх творах сатырычны запал аўтара скіраваны супраць чыноўнікаў, якія апранаюць маскі куратараў народа — яго так званых «апекуноў» і «ахоўнікаў» мовы («Ты не першы»), наваяўленых янычараў («Ці не годзе?»), бязвольных рабоў, новых хаўруснікаў і кар'ерыстаў («Знойдзеш!»). Ёсць у Гілевіча і постаці «пераходныя», героі, што стаяць на краі бездані і ў любы момант могуць у яе зваліцца. Урывак з аднаго з іх — «Дзе вы?» — мы працытавалі вышэй. Клопат мастака-гуманіста найперш пра іх. Заклік паэта

адрасаваны таксама ім. І яшчэ — сабе самому, сваёй балючай памяці. Паэт свядома ідзе на Галгофу ў імя вялікай праўды, верыць, што некалі «здраднікаў косці адрыне зямля», што часовае здранцвенне пройдзе. Аднак, на думку мастака, працэс абуджэння — надзвычай драматычны і складаны.

Пасля прачытання абсалютнай большасці трагедыйных па змесце твораў Гілевіча ў свядомасці чытача заканамерна з'яўляецца пытанне: «А ці мае паэт пазітыўную праграму? У што ён верыць?». Ёсць у аўтара (праўда, іх не так шмат) вершы, у якіх супрацьпастаўляецца жорсткая рэальнасць святлу матчынай шчырай усмешкі, цеплыні яе мяккіх рук (зусім, як у Максіма Танка), шчырасці народа, які збярог праз гады свае звычаі, песні, танцы (як у творы «На экране — беларускія вячоркі...»), пра светлае юнацкае каханне, што стаіць над палітыкай, над усімі «сваркамі і звадкамі», як некалі сказаў класік нашай нацыянальнай літаратуры, шчыры адраджэнец. Усе пазітыўныя моманты чалавечага жыцця аўтар зборніка звязвае з праблемай нацыянальнага захавання, выжывання, лічыць, што яно магчымае ва ўмовах разгортвання агульначалавечых спраў і гуманістычных учынкаў. Такім чынам, агульначалавечае, паводле народнага паэта, з'яўляецца грунтам нацыянальнага квітнення і трываласці. Невыпадкова перараджэнцы, манкурты ў паэтавым апісанні забыліся не толькі на свае родныя карані, але і на абавязкі перад маці, Радзімай, сталі вылюдкамі, пачварамі. Светлы погляд на матчыну ласку і шчырае каханне спыняе аўтара зборніка «Ёсць зямля...» ад канчатковага расчаравання і страты веры ў пераадоленне крызіснай сітуацыі:

Вам душы сорам не праесць да дна.
Вы рэшыце дабіць Радзіму-маці,
Не знаючы, што выжыве яна:
Не ўпершыню ёй з плахі падымацца;

І што, калі да ступняў да яе
Вы на каленях прыпаўзеце заўтра, —
Яна не проста ў вочы вам зірне,
А плюне ў іх з агідай і пагардай.

Такімі палымянымі, строгімі радкамі заканчваецца верш «Тым, што вялі і натхнялі», адрасаваны пярэваратням і здрайцам. У цэнтры твора тры галоўныя вобразы-сімвалы, пад знакам якіх і разгортваецца жыццё чалавечае — Маці, Радзіма,

Плаха. Недзе побач з імі прасвечваецца яшчэ адзін вобраз — Хрыста. Хрыстовыя абавязкі і ўскладвае на свае плечы мастак. Адкрыта, непрымірыма, па-грамадзянску завострана.

Некалькі іншым шляхам ідзе Янка Сіпакоў. Таксама адраджэнец. Не меншы, чым Гілевіч, патрыёт свайго краю, Радзімы. Ён не прыхільнік адкрытага, публіцыстычнага пісьма. Яго адраджэнскі настрой, свядома нацыянальны пачатак у яго творчасці мае больш сімвалічны, прытчавы характар і арыентуецца на шырокі кантэкст. Уласна, гэта форма выяўлення нацыянальнай ідэі эпічная, а не лірычная. У сувязі з гэтым знаходзіцца жанравая спецыфіка творчасці пісьменніка: паэзія хвалюючага пачуцця (зборнік «Дзень»), вершы-воклічы, выгукі, разважанні паступова замяняюцца эпічнымі і ліра-эпічнымі баладамі, гістарычнымі сцэнамі, а затым і прытчамі, разгорнутымі метафарамі вершаванага і празаічнага характару. Праблема нацыянальнай годнасці беларусаў бярэцца ў кантэкст паказу нацыянальнай годнасці розных славянскіх народаў у кнізе «Веча славянскіх балад», якая вытрымала два выданні і мае унікальны характар. На фоне польскіх («Мячык»), рускіх («Кукіш»), македонскіх («Пытанне») і іншых твораў пра няскоранасць народаў, іх жаданне жыць па свайму ўласнаму разуменню, іх незвычайнага патрыятызму паўстае і наш беларускі народ, для якога і агульнанародная, і асабістая свабода неаддзельныя ад вечных ісцін, сярод якіх і кніжнасць, як у баладзе пра Скарыну, і каханне («Вяселле»), і незалежнасць паводзінаў, права асабістага выбару, на якое прэтэндуюць беларускія казакі («Чубы»). Шырокімі коламі разыходзіцца дзеянне ў творах Сіпакова, каб прывесці чытача да канчатковай высновы: народ, вольны і непахісны духам, не скарыць, не зламаць. Толькі адно славянскае племя некалі збаялася чужынцаў, ператварылася ў іх паслугачоў, павярнула мячы супраць братоў-славян — руяне. І знікла з гістарычнай арэны. Урок руянаў відавочны: ад свайго роднага, ад брацкай крэўнасці нельга адракацца. Тэзіс вельмі сучасны, хоць і выказаны ў самы застойны час (першае выданне кнігі датуецца 1973 годам). Уплыў падобных твораў на чытача не вокамгненны, не адкрыты і прамы, а апасродкаваны. Рэцыпіент прыходзіць да вывадаў праз цэлую сістэму сюжэтаў, вобразаў, складаныя лабірынты дзеяння, знаёміцца з абсалютна рознымі этнасамі, іх звычаямі. Сіпакоў вядзе чытача вакольнымі сцежкамі, а не гасцінцам да прызнання неабходнасці смелай барацьбы за самазахаванне. Асабліва ўражваюць польская балада «Мячык» і македонская «Пытанне». Абедзве яны пра Вя-

лікую Айчынную вайну. Пра мужнасць, вернасць свайму крэўнаму, роднаму дзіцяці-паляка — вязня канцлагера, які разгледзеў, распазнаў у дзядзьках у белых халатах сваіх катаў, якія хочуць высмактаць шпрыцамі з яго і іншых малых кроў, і абвясціў на ўвесь свет, што ён — «поляк малы», і Кочы Маркоўскага — македонца, хлебароба, якога грэкі-аваеўнікі забіваюць на полі, проста каля воза, на якім сядзіць яго сын. Забіваюць за тое, што не адмовіўся ад свайго імя, ад сваёй нацыянальнасці. Са словамі «я — македонец, мужык» на вуснах і загінуў чалавек, ды не адрокся каранёў, не выракся свайго імя і імя роднага народа.

У кнізе «Тыя, што ідуць» (1993) змешчаны прытчы і метафары пісьменніка, які хоча бачыць свой народ відушчым. А значыцца — свядомым, які ведае сабе цану, можа за сябе пастаяць. Відушчасць — шматзначнае слова, гэта — вобраз-сімвал. Відушчасць — тое, што робіць нас людзьмі, выводзіць з цемры на шырокі прастор жыцця. Так разгортваецца філасофская думка ў творах Сіпакова пра наш край і народ, здольны перамагчы цемру і выйсці да святла.

**Юлія САЛЬНІКАВА**

## ЯНКА КУПАЛА: ТРАГЕДЫЙНАЕ АСЭНСАВАННЕ РЭЧАІСНАСЦІ

Янка Купала... Велічная постаць у гісторыі беларускай нацыі. Глыбіню ягонага генія наўрад ці здольны спасцігнуць нават сённяшнія ягоныя нашчадкі. Здаецца, столькі ўжо выказана, напісана, і, тым не менш, з кожным новым набліжэннем да Купалавай асобы адчуваеш мізэрнасць усялякіх высілкаў, скіраваных на разуменне творцы.

Айчыннае літаратуразнаўства даўно звярнула ўвагу на трагічную дамінанту творчасці Купалы. Пры гэтым дыяпазон існавання адзначанай эстэтычнай катэгорыі па розных ацэнках даследчыкаў выяўляецца ў рознай ступені. Так, у энцыклапедычным даведніку «Янка Купала» сцвярджаецца, што трагічнае займае значнае месца ў дакастрычніцкай творчасці Купалы, але разам з тым дадаецца, што нават самым трагічным творам паэта ўласцівы аптымістычны пафас за кошт «бязмежнай веры ў канчатковую перамогу народнай праўды-справядлівасці»[1]. Цікавы купалазнаўца Дз. Санюк увогуле называе Купалу пры-